Голас Радзімы

ШТОТЫДНЁВАЯ ГАЗЕТА
БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА «РАДЗІМА»

№ 52 (2246) 26 снежня 1991 г. Выдаецца з 1955 г.

Цана 8 кап.

## «ГОЛАС РАДЗІМЫ»

віншуе ўсіх сваіх чытачоў і прыхільнікаў з надыходзячым Новым, 1992-м годам!

Суайчыннікам на Радзіме жадаем вытрываласці і цярплівасці ў пераадоленні ўсіх нягод, што нам нясе гэты сумны і непрадракальны час.

Суайчыннікам за межамі Бацькаўшчыны жадаем дабрабыту і ўтульнасці пад кожным дахам, хай у вашых сэрцах жыве спагада да сваёй любай Беларусі і гатоўнасць дапамагчы ёй у гаротным паслячарнобыльскім становішчы.

Усім зычым радасных і вясёлых Калядаў і шчаслівага Новага года!

Спадзяёмся на больш цеснае супрацоўніцтва чытачоў са сваёй газетай.

РЭДКАЛЕГІЯ.



18 снежня 1991 года сталіцу Рэспублікі Беларусь Мінск наведаў дзяржаўны сакратар ЗША Джэймс Бейкер. Яго візіт працягваўся ўсяго некалькі гадзін, а пасля сустрэчы са Старшынёй Вярхоўнага Савета Станіславам Шушкевічам і іншымі афіцыйнымі асобамі Дж. Бейкер сказаў журналістам усяго некалькі слоў: ён задаволены вынікамі сустрэчы, якую лічыць вельмі карыснай.

Надта задаволены і Станіслаў Шушкевіч ды Вячаслаў Кебіч, галоўным чынам, тым, што кантакты былі непасрэднымі, а не праз Маскву. Без пасрэдніка для двух бакоў многае праяснілася. Напрыклад, тое, што да Беларусі не дайшлі велізарныя сродкі, выдзеленыя ЗША на гуманітарную дапамогу.

Дасягнута дамоўленасць аб абмене консульствамі Рэспублікі Беларусь і ЗША.

НА ЗДЫМКУ: у час сустрэчы Дж. БЕЙКЕРА І С. ШУШКЕВІЧА.



Па ўсім відаць, што застануцца сёлета юныя мінчане без святочных падарункаў і цацак: і гэтыя тавары адсутнічаюць у продажы. А тое мізэрнае, што вось так прадаецца з рук, пераднавагодні попыт задаволіць ніяк не можа.

Фота В. СТАВЕРА.

### Рыгор ВЯЧЭРСКІ: У ПАЛІТЫКУ ПАВІННЫ ІСЦІ ЛЮДЗІ З ЧЫСТЫМ СУМЛЕННЕМ

# ХАЙ НЕ ПАКІНЕ ВАС НАДЗЕЯ

— Рыгор Арсеньевіч, ведаючы вас даўно як чалавека спагадлівага сэрца, як спецыяліста з высокай рэпутацыяй, якому Богам дадзены талент лекара, я быў нямала здзіўлены, што вы далі згоду балаціравацца кандыдатам у народныя дэпутаты Вярхоўнага Савета тады яшчэ Беларускай ССР. Цешуся, што вы перамаглі. Але дагэтуль не разумею, навошта вам было, даруйце, лезці ў палітыку — гэтую «брудную справу», як кажуць нашы замежныя суайчыннікі. Дык усё ж як вы рашыліся на гэты крок!

— Гэта сталася не з маёй волі. Не меў я ані такой думкі, ані жадання. Калі ішла кампанія па выбарах народных дэпутатаў СССР, мае землякі, калгаснікі, хацелі вылучыць мяне кандыдатам. Я нават не ведаў пра гэта. Але тады з такой ініцыятывай знізу ніхто не лічыўся. У кіруючых крэслах ведалі лепш, хто павінен быць дэпутатам. Прывезлі генерала Кастэнку, камандуючага Беларускай ваеннай акругай, паказалі выбаршчыкам, сказалі, за каго яны маюць галасаваць, і справа была зроблена.

Але, паўтараю, палітыка мяне тады не цікавіла, і тыя выбары мяне не турбавалі. Ды праз год пачаліся выбары ў наш Вярхоўны Савет, рэспубліканскі. Мае землякі, зацяўшыся ад фіяска на тых выбарах, зноў вылучылі мяне кандыдатам у дэпутаты. Наперакор раённым уладам, якія павінны былі «праціснуць» кандыдатуру другога сакратара Мінскага абкома партыі Бычака.

Я вось так, як і сёння, чытаю слухачам лекцыю, выходжу ў перапынку на калідор, а мяне чакае група землякоў. Пяцёра чалавек прыехала: «Арсеньевіч, хочаце — лайце нас, мы вас вылучылі кандыдатам». Патрабуюць маёй згоды і кажуць: «Не пойдзем з вашага кабінета, пакуль не засведчыце сваю згоду на паперы».

Гэта для мяне было страшэнна нечакана. Я не збіраўся лезці ў вялікую палітыку, тым больш — у наш такі складаны і смутны час. Але мяне пераканалі, што гэта трэба, для людзей трэба. І пачалася перадвыбарчая барацьба. Вось калі я зразумеў, якая брудная справа — палітыка. Тады яшчэ мелі моц райкомы ды гаркомы партыі. Як толькі ў Барысаве стала вядома, што я збіраюся балаціравацца, запрацавала кіруемая партапаратам машына працідзеяння. Бычак здымае сваю кандыдатуру, а замест яго супраць мяне выстаўляюць аж чацвярых. Са мною б'юцца самым бессаромным чынам.

Мне некалькі разоў зрывалі сустрэчы з выбаршчыкамі, да таго ж — у вялікіх калектывах. У дзень, калі я павінен быў выступаць у Жыцькаве, той вёсцы, дзе вучыўся ў школе, мяне на вакзале спаткалі двое незнаёмых бамбізаў і хацелі, відаць, пакалечыць, разбілі нагу. Сустрэча, вядома, не адбылася. Следам за мной па выбарчай акрузе ездзілі райкомаўскія работнікі і распавядалі пра мяне такія, напрыклад, «весткі»: гэты прафесар —

(Заканчэнне на 3-й стар.).

У КДБ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

## БАКАЦІН ПАРУШЫЎ ПАГАДНЕННЕ

**У адказ на перадачу кіраўніком МСБ Бакаціным паслу ЗША ў СССР дакументаў, якія раскрываюць схему ўкаранення і выкарыстання падслухоўваючых устройстваў у будынку пасольства ЗША ў Маскве Камітэт Дзяржаўнай Бяспекі Рэспублікі Беларусь зрабіў наступную заяву:**

**Агульнавядома, што ва ўсім свеце спецслужбы ў рамках існуючых дзяржаўных структур у мэтах фарміравання і прыняцця палітычных рашэнняў урадамі выконваюць задачы па атрыманню разведвальнай інфармацыі, у тым ліку і з выкарыстаннем тэхнічных сродкаў.**

**Якім бы ні быў узровень міждзяржаўных адносін, мы перакананы, што не падлягаюць перадачы і выдаванню звесткі, якія наносяць шкоду бяспецы дзяржаў. Так і зрабілі амерыканскія спецслужбы, не прадаставіўшы аналагічныя дакументы пры выяўленні спецыяльных тэхнічных устройстваў у будынку пасольства былога СССР у ЗША.**

**Звернута ўвага Бакаціна таксама на тое, што ён сваімі дзеяннямі груба парушыў двухбаковае пагадненне з Рэспублікай Беларусь па пытаннях забеспячэння дзяржаўнай бяспекі і выклікаў сумненні ў мэтазгоднасці далейшага ўзаемадзеяння з МСБ.**

*«Сапраўдныя палітыкі павінны кіраваць дэмакратычнай стыхіяй, як гаворыцца, у «прасторы» і «ў часе». У Беларусі ж я пакуль не бачу палітычнага руху, які б абапіраўся на глыбокую філасофскую аснову. У нас нямала прыстасаванцаў, якія з вялікім захапленнем раней выкладалі марксізм-ленінізм і сцвярджалі, што хацелі зрабіць вашы веды — вашымі перакананнямі. Але так хутка «перастроіліся» ўды сёння сцвярджаюць, што наша краіна (у той час, калі яны абаранялі свае дысертацыі) была краінай манапалістычнага — у самым суровым сэнсе — капіталізму. І з'яўляюцца самымі ярымі крытыкамі. (Заўважце, што ўдумлівымі крытыкамі з'яўляюцца тыя, хто і раней, і цяпер працуе сумленна).*

*У нас ёсць парасткі сацыял-дэмакратыі. (Я сам прыхільнік гэтай плыні і лічу, што яна перспектыўная ва ўмовах нашай рэспублікі). Але, на жаль, пакуль што бачу, як ужо існуючыя аб'яднанні сацыял-дэмакратычнай накіраванасці канкурыруюць паміж сабой, стараючыся ўзнесціся адно над адным. Усё гэта стымулюе некіруемыя працэсы ў грамадстве».*

*(З інтэрв'ю Старшыні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Станіслава ШУШКЕВІЧА газеце «Знамя юности»).*

МАЁМАСЦЬ КПСС

## ЗМЯНІЛІСЯ ГАСПАДАРЫ

**У іншай якасці пачаў служыць грамадству былы грамадска-палітычны цэнтр у Гродне. Камфартабельны трохпавярховы будынак са шкла і бетону, які практычна пуставаў у апошні час, цяпер абжываюць студэнты і выкладчыкі размешчанага па суседству універсітэта. Пакуль сюды перасяліўся факультэт беларускай філалогіі і культуры. Але ў хуткім часе яго суседам стане яшчэ адзін — педагогікі і методыкі пачатковага навучання. Гэтым нечаканым наваселлем значна аблегчана зацяжная праблема арганізацыі заняткаў ВНУ, што літаральна задыхалася з-за недахопу аўдыторый. Праўда, да вырашэння пытання аб лёсе партыйнай маёмасці новае памяшканне лічылася ўзятым у кароткатэрміновую арэнду.**

**Раней новым гаспадарам перайшоў будынак былога абкома КПБ. Частку старога памяшкання заняў гісторыка-археалагічны музей, частку — абласная бібліятэка. Яшчэ раней незапланаваныя наваселлі справілі дзіцячая паліклініка і філіял дзіцячай музычнай школы. Першая перабралася ў будынак былой спецпаліклінікі, другі — у ціхі каменны асабняк, дзе некалькі дзесяцігоддзяў жылі першыя сакратары абкома КПБ.**

МІЖНАРОДНЫЯ ВЫСТАЎКІ



**Міжнародная выстаўка «Інтэр-рэа-мед-91» прайшла ў выставачным комплексе «Мінскэкспа» на праспекце Машэрава ў Мінску. Па запрашэнню рэспубліканскай асацыяцыі чарнобыльскіх фондаў, Міністэрства аховы здароўя, Гандлёва-прамысловай палаты Рэспублікі Беларусь і яе партнёра па арганізацыі міжнародных выставак германскай фірмы «Трэйдком» сем замежных фірм прадставілі ўзоры сваёй медыцынскай тэхнікі, абсталявання, інструментарыя, прыбораў. Асобае месца ў экспазіцыі займалі сродкі ўзнаўлення працаздольнасці, рэанімацыйнае і рэабілітацыйнае абсталяванне, у тым ліку і спецыяльнае для аказання дапамогі ахвярам чарнобыльскай трагедыі.**

**НА ЗДЫМКУ: адзін з ініцыятараў міжнароднай выстаўкі — настаяцель будуемага ў Мінску храма ўшанавання іконы Божае Маці «Усіх Тужлівых Радасці» і памяці ахвяр Чарнобыля айцец Ігар (свецкае імя— Ігар КАРАСЦЯЛЁЎ).**

ПРЫЗНАЧЭННІ

## МІНІСТР ПА СПРАВАХ АБАРОНЫ

**Як вядома, Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь прыняў рашэнне ўтварыць Міністэрства па справах абароны. Першым міністрам новага ўрадавага падраздзялення прызначаны былы начальнік штаба Прыбалтыйскай ваеннай акругі генерал Пётр Рыгоравіч Чаўс. Ваенны міністр рэспублікі родам з Гомельшчыны. Ён прыхільнік захавання адзіных Узброеных Сіл новай садружнасці дзяржаў.**

**На тэрыторыі Беларусі цяпер праходзяць службу 180 тысяч чалавек, утрыманне іх абыходзіцца нам у 17 мільярдаў рублёў. Таму першым клопатам П. Чаўса стала — дабіцца згоды Расіі і Украіны, каб гэты непамерны цяжар узваліць не толькі на нашы плечы. У будучыні ваенны кантынгент на тэрыторыі Беларусі будзе скарочаны да 90 тысяч чалавек.**

ЭКСПРЭС-ПОШТА

**Міжнародная экспрэс-пошта пачала працаваць у Мінску. Яе служачыя бяруцца не толькі ў лічаныя дні даставіць у любую частку зямнога шара карэспандэнцыю, бандэролі, пасылкі, але і гарантуюць іх захаванасць. Дзеючая сістэма адсочвання па каналах міжнароднай экспрэс-пошты дазваляе дакладна ведаць знаходжанне кожнага адпраўлення ў любы момант часу па ўсім шляху яго руху.**

**НА ЗДЫМКУ: аператар экспрэс-пошты Анжэла СУПРУН.**




# НАВАГОДНІЯ ЭЦЮДЫ

## (З ФАРБАМІ КАЗКІ, АНТЫУТОПІІ І БУФАНАДЫ)

Новы год...

На парозе 1992-гі, маладзенькі, зухаваты. Б'е паклоны на ўсе бакі, віншуючы абы-якую, абы жывую, істоту. Так ужо стараецца прыдаць сабе выгляд веселуна-гарэзы. А ў самога цёмныя-цёмныя цені па тварыку ходзяць. Ужо ж таму, што бачыць, як, накульгваючы на абедзьве нагі, збіты на горкі яблык крызісамі і нашым вар'яцтвам, адыходзіць у гісторыю стары 1991-шы. І, нібы апраўдваючыся, шэпча: «Я ж прынёс вам незалежнасць». Але, як бы хтоколечы ні наракаў на старога, прыход Новага года — самая пажаданая, шчырая і сапраўдная ўрачыстасць. Можа таму, што пазбаўлена палітычных адценняў. І, каб не здрадзіць гэтай праўдзівасці, па-людску падрыхтавацца, накрыць святочны стол, мы, як учадзеўшы ад недастачы самага надзённага, хваляванняў, страху перад купоннай будучыняй, лётаем па гандлёвых месцах. А яны адказваюць рогатам пыльнай пустэчы. Бывае, што пойдзе і рэхам вернецца назад пагудка: «Во-о-одку даюць...» Умомант на вярсту расцягваецца чарга-змяя: хвост тоненькі, галава расце штохвілінна, як у гідры, і дзесяткамі кашчавых локцяў прадзіраецца з талонамі да прыцягальнага вакенца. Топча ў гразь слабых і парадкапаслухмяных, апошнюю чалавечую годнасць. І раптам над гэтай галавой, пад бруеннем калектыўнага сораму і прыніжэння, раз-пораз пачынае ўзлятаць міліцэйская дубінка, выбіваючы па рэбрах чырвананосых нахабнікаў глухі дроб святочнага маршу перабудовы. «Во правільна, во правільна, так ім і трэба, гэтым п'яніцам. Зусім сумленне страцілі»,— пахвальным гулам адклікаецца тулава і хвост чаргі на скоры і праведны суд «анёла-дубінканосца».

У кавярні «дзяжурыць» (бачу яго тут неаднойчы) старэнькі згорблены папрашайка. Ужо досыць чакаць, покуль нехта недаесць напалову сырую булачку ці недап'е шэра-бура-малінавую вадкасць, што называецца «кофе с молоком». Просіць сам, ліслiва заглядаючы ў вочы, бо цяпер дапіваюць і даядаюць... Жанчына ва ўзросце запаволенымі ад нечаканасці рухамі ломіць папалам ватрушку і працягвае бедалагу, і — слёзы пырснулі з вачэй... Той моўчкі і борзда адрывае бяззубымі дзёснамі кавалачкі ад падачкі, пасвячонай слязамі, падаецца ў другі куток.

Чую па радыё: у пясчаным кар'еры знойдзены згноеныя кілаграмы ялавічыны, кілбасы, курацiны.

Сын, адарваўшы позірк ад кніжкі, паставіўшы палец на недачытаны сказ, звяртаецца да мяне з недаверам у голасе: «Бацька, чуй, тут пішуць, што немцы ў канцлагеры давалі палонным чорную каву. Хлусня, гэта ж такі дэфіцыт!» Мяне аж перасмыкнула.

Новы год...

Мае маленькія суграмадзяне ўжо за дзён колькі пільна рыхтуюцца да хвалюючай сустрэчы з Дзедам Марозам, Снягурачкай. Усё ярчэй зіхацяць у вачанятах радасныя агеньчыкі, усё з большым натхненнем развучваюцца вершыкі і песні. Усё часцей разам са сном прыходзіць салодкае ўсведамленне, што ў навагоднюю ноч знойдзе мой карапуз пад падушкай ці пад ёлкай чароўныя падарункі, цукеркі.

У вячэрнім тралейбусе хлапчанё тлумачыць матулі: «Мамачка, а Дзед Мароз не прыйдзе да нас на ёлку, як летась...»

Дзед Мароз, надта занепакоены адсутнасцю цацак у гандлёвай сетцы, абвясціў Вялікае Перамір'е і сабраў звяроў дрымучага лесу на сход-нараду. Сам сядзіць у задуменні на пні і гойдаецца ўзад-уперад. Дзе ўзяць гасцінцы? Дзе купіць мяшок? А паслухаць чатырохногіх лясных насельнікаў, дык з глузду з'едзеш. Барсук раіць звярнуцца за дапамогай у Федэрацыю прафсаюзаў рэспублікі, заяц, касавокі губашлёп,— у альтэрнатыўныя прафсаюзы. Ліса гатова ехаць за мяжу, прасіць гуманітарнай помачы. Ужо не кажучы пра ваўка. Да чаго дагаварыўся, цынічная сыць, пачэсваючы аблезлую ад радыяцыі бакавіну: «Чаго ты, дзед, так за людзей хварэеш? Яны хутчэй, чым я, зразумелі, добра вывучылі, што лепшы кусок мяса заўжды дастаецца ваўку. А цацкі хай у камерцыйным магазіне купляюць альбо з анучак круцяць». «Эх-эх-хе,— уздыхнуў Дзед Мароз,— у той камерцыйнай краме адзін толькі фартушок імпартнай лялькі Sindy каштуе столькі, колькі мае нагавіцы. А што да анучак, дык іх не знойдзеш, людзі ўзамен на накрыўкі для слоікаў паздавалі...»

Задумаўся над гэтым становішчам і я. Сапраўды, калі не памыляюся, у мінулым годзе мала што ні за месяц мы ўжо даўно і актыўна мерзлі, гадзінамі выстойвалі на спецыяльных рынках, каб купіць ёлачку. У вялікіх магазінах поўнай хадой працавалі секцыі па продажу ёлачных цацак. А сёння (застаецца менш чым два тыдні да свята) ані руху, ані духу.

Высвятляю гэты стан рэчаў ва Упраўленні гандлю Мінгарвыканкома. Пане дабрадзею, на працягу некалькіх дзён пускалі мяне ў гэтай установе, адказнай за камерцыю ў сталіцы незалежнай дзяржавы і Садружнасці, як з прашчы, з аднаго аддзела ў другі ад кіраўнікоў да выканаўцаў, даючы неіснуючыя тэлефонныя нумары, адмаўляючыся назваць сваё прозвішча. І неяк падазрона пачаў я прыслухоўвацца сам да сябе: бадай што, без анёла і яго мяча мы да толку не дойдзем...

Новы год! Прэч з хаты смецце і нягоды мінулага 1991-га, Шырэй дзверы чыстаму паветру пушчы, водару снегу, смалы, навагодніх свечак, ачышчальнай радасці свята! Дарогу Дзеду Марозу і Новаму 1992-му, маладзенькаму, зухаватаму, што нясе адзінае выратаванне — надзею! А там і да шчасця блізка.

**Назіраў, быў сведкам, маляваў**
**Кастусь ШАЛЯСТОВІЧ.**




225

Прыехаў яе брат-інжынер і зазначыў мне, што я павінен выбрацца падабру-паздарову, адкуль прыйшоў, інакш ён падасьць мяне ў суд за шантаж. Ну што ж, сабраў свае інструмэнты ды вось і еду. На тое мы эмігранты, каб раз'язджаць". Тамашэвіч засьмяяўся. Тугоўскі ня мог схаваць свайго задавальненьня й праз усьмешку казаў:

— Так і трэба такім здраднікам...

— Так што ты зараз ня маеш канкурэнта, й твая Маргарыта можа табе належаць цалкам, — засьмяяўся Тамашэвіч.

— Я спаліў усё, чаму пакланяўся, — зазначыў Тугоўскі.

— А ўсё ж такі... Чаго не бывае. А вось яшчэ навіна... Між іншым, твая Маргарыта стала камсамолкай й запісалася ў марксысцкі гурток.

— Вярхоўская? — зьдзівіўся Тугоўскі. — Яна, дачка папа?

— А ўжэ ж, — засьмяяўся Тамашэвіч, — дачка папа — і камсамолка.

І ён, сьмеючыся, пакінуў Тугоўскага і пайшоў купацца. Тугоўскі глядзеў, як ён плыў па Влтаве, быццам рыба, і думаў аб кінутай ім загадцы: дачка папа й камсамолка. Яна заставалася для яго маўклівым сфінксам, і ніякія, напэўна, сілы не маглі прымусіць яе раскрыць свае тайны. Ён устаў і, не чакаючы, пакуль Тамашэвіч вылезе з вады, пайшоў у самы цэнтр паўвострава, дзе гучаў патэфон і стаялі столікі з настаўленымі бутэлькамі. Хадзіць у вопратцы па пляжу было нязручна: ужо не адна жанчына касілася на яго, думаючы, што ён прыйшоў падглядзець за імі. Ён сеў за столік й папрасіў сабе бутэльку піва. У той самы час, як ён пачаў аглядаць навокал столікі, яго пагляды спаткаліся з пільнымі паглядамі знаёмай жанчы-

226

ны: за суседнім сталом сядзела ў купальным касьцюме Вярхоўская. Яна была як русалка, і яе чырвоная шапачка вельмі йшла да ружовага і поўнага твару. Мокры касьцюм шчыльна аблягаў яе стройную фігуру і выдзяляў высокі бюст; ад усяго вобразу нясло маладым шалам і моцным здароўем.

Тугоўскі ад нечаканасьці пачырванеў і зьмяшаўся. Ён нават не адразу павітаўся з ей. У яго не было ніякага жаданьня пераходзіць да яе за столік і пацешыць яе сваей размовай. Але што было рабіць? Ён падыйшоў да яе.

— Вось так сустрэча, — прамовіла яна сьмеючыся, — а я даўно тут сачу за вамі. Я думала, вы не захочаце падыйсьці...

— Што вы... Чаму-бы я не захацеў?

— Хто ведае, можа быць вы яшчэ на мяне злуецеся? — Яна засьмяялася. — Калі ласка, — ветліва зазначыла яна.

Ён перанёс сваё піва й пачаставаў яе.

— Дазвольце наліць вам за нашу сустрэчу...

— Так, за вашы посьпехі, за адраджэньне грамадзяніна Тугоўскага! — падняла яна шклянку.

Яны выпілі піва, задаволеныя і ўзбуджаныя ўзаемнымі паглядамі. Тугоўскі стараўся не глядзець на яе. Яму было крыху сорамна бачыць яе ў такім выглядзе, але як на злосьць вочы яго мімаволі ўпіраліся ў яе прыгожы і высокі бюст. Ён нікуды іх ня мог схаваць.

Яна сама прыкмячала гэту яго сарамлівасьць, што прымушала яе чуць сябе няпэўнай.

— Пачакайце, — прамовіла яна нарэшце, — за намі пільнуюць. Крыху нязручна. Адну хвіліну — я апрануся.

Яна вярнулася ў капелюшу, у прыгожым летнім

227

убраньні, і яны пайшлі ў глыб паўвострава, удаль ад людзей па высокай і густой траве. Яна йшла блізка каля яго, і ён чуў яе пах, узбуджаючый яго таксама, як тады, калі ён першы раз пакахаўся з ей. Яна зьмяніла цяпер адношаньні да яго, і па ўсяму ён бачыў, што яна гатова была апёрціся аб яго руку й йсьці блізка каля яго ўсю дарогу. Якая насьмешка лёсу. Цяпер ён пачуў узаемнасьць жанчыны, якую калісьці кахаў, цяпер, калі ў яго зьявіўся сыфіліс у другой стадыі. Яна йшла як ахвяра, ня ведаючы, каля якой жахлівай небяспекі яна йшла, на каго хацела апёрціся, да каго датыкнуцца сваімі гарачымі вуснамі. Яму стала шкода яе. Ён быў-бы праступнікам, яго можна было-б па закону пасадзіць у турму, каб зараз ён даткнуўся да яе й перадаў ей жахлівую пошасьць.

Але яна ўзбуджала яго. Яна сама, быццам назло, вяла яго праз паўвостраў, далей і далей ад людзей — у поле, апутываючы сьвядомасьць сеткай граха. Яны выйшлі ў поле й селі на траву. Стала цямнець. Ён узяў яе мяккую руку, каб пагадаць, як раптам, быццам непрыкметна, яго рука сьлізнулася па ўсей фігуры. Яму паказалася, што гэта будзе груба і яна за гэта можа непрыемна адудзячыць яму, але яна не зварушылася. Ён схапіў яе стан і, як непрытомны, прыцісьнуў свой твар да яе пахучых валос.

— Што вы робіце? — шаптала яна, але не зварухнулася ні адным мускулам, яе рука пакорна ляжала ў яго руцэ, толькі яе рот сох, і гарэлі вочы.

"Што запраўды я раблю? Я праступнік, я арыштант, я заражу яе сыфілісам", — стукала калючымі малаткамі ў мазгу, але локаны валос прыемна шчакаталі вуха, і ён не памятаючы сябе схапіў яе галаву і ўпіўся ў яе вусны гарачым даўгім

228

пацалункам. "Няхай, — стукала ў віскі, — заражу яе моднай хваробай. Усё роўна яна камсамолка... Гэта ей нагарода за яе буржуазнае паходжаньне, за яе здраду з патрыцыем Загорскім". І ён доўга цалаваў яе твар, быццам хацеў у ўсе мейсцы пацалункаў уліць кроплі жахлівага яду.

## VI

Тугоўскі не паказываўся ў Студэнцкім доме. Яму сорамна было паказацца на чужыя вочы, яго грызла безупынна сумленьне, што ён заразіў Вярхоўскую. Думка аб тым, што калі-небудзь Вярхоўская пабача на сваім целе жахлівую прымету хваробы, не давала яму ні днём ні ўночы спакою. Што ён нарабіў? І чаму ўласьне лёс, ці выпадак, ці праклятьі Сатурн зрабіў так, што яна ўзбудзіла ў ім пачуцьцё ў той момант, калі ён быў хворы, што яна пачула да яго нейкі наплыў сымпатыі і каханьне ў той момант, калі ён быў ахоплены новым росквітам хваробы. Ці не была зноў тут чыясьці злая й праступная насьмешка? Хаця якая насьмешка? Такая самая насьмешка, як тая сіла прыроды, што гоне чамусьці матыля на вагонь і прымушае яго апаліць крылы? Разумнага ў гэтым няма нічога, а між тым гэта імкненьне матыля, і яго бяссільная спыніць якая-небудзь лёгіка. Так сталася! Можа быць, ня чуў-бы у сабе ён гэтай жахлівай хваробы, ня меў-бы ён крыху злосьці на жанчын наогул, віноўніц мужчынскіх мук і хвароб, і не насі ён у сабе помсты да яе, Вярхоўскай, як адзінай віноўніцы таго, што ён адважыўся йсьці да начной дзяўчыны, — ён ня быў-бы такім сьмелым, грубым, і магчыма ўсё пайшло-б інакш. Але так сталася: чыясьці рука і ўплывы нейкага Сатурна зьвілі

229

іх шляхі разам і прывялі іх да трагічнай разьвязкі. Цяпер, здавалася, усё было скончана. Калі-б выявілася, што Вярхоўская запраўды захварэла, яму ў Празе заставацца больш ня можна было-б. Ня толькі таму, што пачаліся-б жахлівыя сцэны, сьлёзы, лаянка, нараканьні, крыкі загубленай маладой жаночай душы, але й таму, што сам закон прывёў-бы яго на турэмную лаву. Ён павінен быў-бы ехаць як мага хутчэй. Яго стыпэндыя й асьвета была-б закінута ўжо аканчальна й беспаваротна.

Але куды ён мог-бы паехаць з сьвядомасьцей таго, што ў Празе ён зрабіў вельмі брудную і ганебную авантурную справу, куды ён мог-бы паехаць з бацыламі разьвіваючайся безупынна па ўсяму целу хваробы? Дзе, на якой частцы зямной кулі ён мог-бы пачаць новае жыцьцё? Тады ўжо напэўна яму заставалася-б толькі скончыць сваё жыцьцё.

З такімі думамі ён хадзіў па ваколіцах Прагі, па садзе інтэрнату й нідзе ня мог знайсьці спакою. Адзін раз за Прагай, на мурах старой крэпасьці Вышаграду, спаткаў ён беларускага студэнта Каруся.

— Ты як папаў сюды? — спытаў той сваім моцным голасам, як ерыхонская труба.

Пачалася размова. Мімаволі Тугоўскі, чые думкі былі заняты толькі сваей хваробай і тым жахлівым паложаньнем, з якога, напэўна, дрэнная дарога, прызнаўся, што яму прыдзецца страляцца.

— Страляцца? — зьдзівіўся Карусь, — і ў цябе запраўды гэтая знакамітая хвароба ў другой стадыі?

— Так. Я думаю — сапраўды, хоць трэба будзе пачакаць яшчэ некалькі дзён да аканчальнага

230

высьвятленьня справы...

— Гм... Слухай... Вось што... Чым так страляцца, дык лепш загінуць ува імя якой-небудзь ідэі. Усё роўна гінуць, дык лепш гінуць так, каб цябе хоць успомнілі будучыя пакаленьні. Слухай, дружа. — Ён паклаў сваю моцную й вялікую руку на плечы Тугоўскага й пільна пачаў глядзець у вочы. — У адной з суседніх з Чэхаславакіяй дзяржаў у мяне ёсьць пэўныя людзі — загартаваныя ў барацьбе паўстанцы. Табе прыдзецца нелегальна перайсьці граніцу й наладзіць з імі сувязь й сетку паўстанчаскіх арганізацый... Калі-б мы маглі аднавіць ува ўсёй дзяржаве тэрор з дапамогай украінскіх арганізацый, — мы маглі-б сказаць, што зрабілі вялікую беларускую справу. Кроў чалавека мы пераліі-б на алтар Бацькаўшчыны. А людская кроў ніколі ня гіне дарэмна й на гістарычных вагах важыць вельмі шмат. Дык чым губляць сваё маладое жыцьцё проста так бяссэнсава, лепш загубіць яго з карысьцей для грамадзянства, ува імя гісторыі. Праўду я кажу ці не?

Тугоўскі, каторы за ўсё жыцьцё й мухі не забіў, слухаў разважаньні Каруся аб тэрору зусім сур'ёзна, не бачачы ў іх нічога фантастычнага. Яму здавалася, што ўсё ж ткі ў словах Каруся ёсьць лёгіка: заместа таго, каб прыставіць дула рэвальвера да свайго чала, лепш прыставіць яго да чала ворага й ужо потым скончыць з сабой. Прыдаць свайму жыцьцю апошнюю й прыгожую вартасьць.

— Праўду ты кажаш, — махнуў галавой

231

Тугоўскі.

— Дай руку, — радасна прамовіў Карусь і пацісьнуў яго руку сваім зялезным уціскам...

— Слухай, дружа ад гэтага часу я цябе буду лічыць сваім і запішу ў сваю вайсковую арганізацыю... Толькі дысцыпліна: каб аб гэтым нікому ні слова, нават сваім бліжэйшым сябрам. Ні адзін беларус не павінен ведаць аб нашай арганізацыі, асабліва з гэтага інтэрнату. Згодзен?

Тугоўскі задумаўся. Пакуль справа не выходзіла за рамкі агульных слоў аб гісторыі, аб беларускіх ахвярах, усё было добра: ён разумеў, што так трэба было, што гэта было нават прыгожа. Але калі яму трэба было практычна ўвайсьці ў нейкую тайную арганізацыю, ён пачуў нешта непрыемнае, арганічна яму няздатнае, быццам яго прымушалі спусьціцца ў цёмны склеп, напоўнены трупамі.

— Не, пачакай, братка, — прамовіў Тугоўскі ў раздум'і. — Я павінен пачакаць яшчэ некалькі дзён, пакуль атрымаю ад доктара аканчальную вестку аб сваёй хваробе. Толькі тады я магу ўступіць у тваю арганізацыю, бо так ісьці на верную сьмерць я ўсё ж ткі ня згодзен. Гэта вельмі пахне авантурай. — І каб зьмякчыць свае апошнія словы, ён усьміхнуўся і дадаў: — Я ж страляць яшчэ ня ўмею.

— Ня ўмееш? — засьмяяўся Карусь так, што па ўсяму полю панясьліся раскаты сьмеху. — А як жа ты думаў сябе застраліць? Ну, гэта нічога. Будзеш прыходзіць да нас, мы цябе страляць навучым. — І праз хвіліну сур'ёзна зазначыў: — Слухай, дружа, я ўсё ж ткі цябе чакаць. Я сяньня выдаў табе тайну аб існаваньні нашай арганізацыі, а гэта, сам ведаеш, да чаго-небудзь цябе абавязывае. Пакуль што я ад цябе зараз не

232

адстану. Дык дам тры дні на разважаньне. Ну, пакуль што бывай, даражэнькі. — Ён пацісьнуў руку Тугоўскага так, што ў таго хруснулі ў пальцах суставы.

Тугоўскі застаўся адзін на мурах старой крэпасьці, з якой людзі ўнізу віднеліся маленькімі мурашкамі. Ён глядзеў уніз, і яму ўсё жыцьцё стала цяпер здавацца толькі маленькім мізэрным ломцікам. Быццам ён вельмі вырас над усімі й глядзеў на ўсё з вышыні птушынага палёту. Карусь напоўніў яго такім нечаканым ідэалам, што ўвесь яго сьветапогляд, усё яго "я" раптам перавярнулася дагары нагамі. Ён прыдаў нечаканы зьмест яго жыцьцю, ён паклаў на Тугоўскага нават місыю, вялікую гістарычную місыю палітычнага змагара.

Што заставалася яму рабіць?

Праз некалькі дзён ён пачне гніць, і кавалкі яго цела будуць адвальвацца, знача, ён павінен будзе прыняць якія-небудзь рашучыя меры. Гінуць, дык ужо запраўды лепш так, як зазначыў Карусь. Вялікія палітычныя змагары сучаснай рэвалюцыі былі такімі сьмелымі таму, што былі хворыя гэтай самай моднай хваробай.

Але каб дапусьціць, што ён зусім здаровы, ці ня мог-бы, праўдаловей, ці не павінен быў-бы ён і тады стаць на той шлях, на які прапанаваў яму стаць Карусь?

Што такое быў ён, Пётра Тугоўскі, у велізарнай чашы жыцьця? Адзінокая пясчынка, ляжачая без усякага руху ў агульнай масе пяску. Адзінокі чалавек, не знайшоўшы свайго ўласнага шчасьця. Разьбітая маладосьць, прадвяшчаўшая жахлівую, сумную і студзёную старасьць. Студзёная вясна, у каторай замёрзлі кветкі, пажоўклі лісты, як у восені, і ніколі не ўстануць да жыцьця.

Працяг.
Пачатак у №№ 23 — 50.

# Los Gorbachov argentinos

En los angustiosos días de agosto, cuando desde Moscú llegaba información sobre el golpe de Estado, la revista bonaerense "Gente", publicó un artículo acerca de los "familiares" del Presidente de la URSS Mijaíl Gorbachov residentes en Argentina. Viven en la ciudad de Neuquén —afirmaba "Gente"—, y son hijos de uno de los primos del padre de Mijaíl Gorbachov, que se fue de la Rusia zarista en 1912. El corresponsal de la revista soviética "Eco del planeta" viajó a Neuquén en otoño para entrevistarse con los Gorbachov argentinos.

—Pase, por favor —me dijo en ruso un hombre de baja estatura y entrado en años, cuya frente estaba cubierta de grandes lunares, y añadió ya en español: —Me llamo Elías Gorbachov.

Mi interlocutor tiene 67 años y trabajó toda su vida de contador. Ahora está jubilado. Vive con su esposa Anuncia en un acogedor apartamento de tres habitaciones, donde prácticamente no hay nada que haga recordar la lejana patria de su padre Serguéi Antónovich Gorbachov, campesino ruso emigrado. Sólo vi una "matrioshka" que sus amigos le trajeron de regalo de Moscú.

Cuidadosamente Elías pone sobre la mesa los documentos y las fotografías de su archivo familiar. Con la ayuda de Anuncia y de otros familiares, que llegaron un poco más tarde, intentamos reconstruir las principales fechas y sucesos de la vida de los fundadores del "clan" de los Gorbachov argentinos. Traduzco al español (en la familia nadie habla el ruso) la inscripción. hecha en el pasaporte, el único documento original de su padre que se ha conservado: "El portador del presente pasaporte, campesino Serguéi Antónov Gorbachov, de 16 años de edad, se dirige al extranjero. Para su paso libre a través de la frontera se expide el presente pasaporte con cuño de la ciudad de Libava el día 24 de octubre del año 1912".

La historia de la rama argentina de los Gorbachov es la siguiente. Serguéi Gorbachov, hijo de Antón Gorbachov y de Akulina Vasurenko, nació el 27 de junio de 1897.

—Mi padre me contó que ellos vivían a orillas del Volga y que iban con frecuencia al río para bañarse y para pescar —me dice Elías.

Según se señala en la partida de nacimiento, Alejandra, la futura esposa de Serguéi, nació el 24 de mayo de 1902 en la ciudad de Tambov de la parte europea de Rusia. Llegó con sus padres a Buenos Aires el 7 de diciembre de 1912. Junto con esa familia arribó Serguéi Gorbachov, que a la zazón tenía 15 años (seguramente se añadió un año para poder obtener el pasaporte). Desconocemos las razones que impulsaron al joven aldeano a emprender una travesía tan larga y bastante peligrosa, si lo guió el deseo de encontrar en la lejana Argentina una vida mejor, o el tierno amor infantil por Alejandra. Los hijos nunca se lo preguntaron a Serguéi Antónovich, así que sólo podemos hacer conjeturas.

Poco después de su llegada a Argentina Serguéi y Alejandra se casaron. En 1919 nació su primer hijo Pedro. Luego con un intervalo de dos años nacieron tres hijos más: Antonio, Elías y Olga. En aquellos años la joven familia de los Gorbachov recorría en busca de algún empleo la provincia de Buenos Aires, cuyo paisaje se parece un poco al de la llanura rusa. Allí se quedaban para trabajar la tierra muchos campesinos emigrados rusos. Los Gorbachov, acostumbrados al duro trabajo de campesinos, se ganaban la vida labrando la tierra y criando ganado.

A fines de los años 30 la familia se trasladó a la provincia de Neuquén, a las tierras de los mapuches y de los araucanos, que en aquel entonces comenzaron a ser potenciadas por emigrados de Europa. Serguéi Gorbachov encontró allí un trabajo permanente y se afincó con su familia definitivamente.



*"Descubrimos a los primos hermanos de Gorbachov que viven en Argentina", informó sin titubeo a sus lectores una revista argentina. En esta foto, hecha en los años 60, Serguéi Antónovich Gorbachov (en la primera fila a la izquierda) posa junto a los miembros de su familia.*

Según recuerdan los familiares, Serguéi Antónovich todo lo hacía muy bien. La gente lo respetaba por su generosidad, por su carácter honrado y bondadoso.

Al mayor de los Gorbachov le gustaba viajar. Estuvo en tos países vecinos: Paraguay, Bolivia y Uruguay. Pero temía viajar a Rusia: "¿Y si no me dejan venir de vuelta? ¿Qué harán ustedes sin mí?" —les explicaba a sus hijos. De vez en cuando, con gran demora, llegaban a Neuquén cartas de Rusia. Aquellas cartas eran el único lazo de Serguéi Gorbachov con su patria, a la cual echaba mucho de menos, como todos los rusos.

—Recuerdo que en cierta ocasión, cuando todavía era niño, mi abuelo me llevó a Bahía Blanca — continúa el relato Luis Alberto, el hijo mayor de Elías—. Cuando nos enteramos de que había allí barcos rusos, fuimos a verlos. Subimos a bordo y mi abuelo se puso a preguntar ansiosamente algo a los marineros. Durante largo rato estuvieron conversando en ruso, idioma que desconozco.

—Mi padre falleció en 1983. Le faltaron dos años para presenciar los tiempos, cuando todo el mundo se puso a hablar de Mijaíl Gorbachov —Elías pronuncia el nombre del Presidente de la URSS de una manera muy familiar y con gran cariño—. Al comienzo pensamos que se trataba de una mera coincidencia de apellidos, pero luego, al ver sus fotos en los periódicos, comenzamos a dudar de ello. El Presidente de la URSS se parecía mucho a Serguéi Gorbachov.

Los Gorbachov argentinos fueron a la embajada soviética en Buenos Aires. Allí los escucharon atentamente y les propusieron presentar todos los documentos existentes para aclarar el asunto. Pero lo malo es que la mayor parte de los documentos se quemaron en el incendio que hubo en el servicio de migraciones capitalino.

—Y abandonamos las búsquedas —interviene en la conversación Antonio, el hermano de Elías—. Es que, comprendános bien, podía ser que fuéramos simplemente tocayos y que la aparente similitud no fuera más que pura coincidencia. En tal caso la gente creería que le estábamos imponiendo el parentezco a un hombre famoso.

A decir verdad, ya en aquel entonces en la prensa argentina aparecieron varios artículos, en los cuales los periodistas afirmaban sin titubear que en Argentina vivían familiares del Presidente Gorbachov. Algunos de los autores reconstruyeron, incluso, el árbol genealógico de la familia del Presidente de la URSS, señalando el grado de parentezco. Sin embargo, semejantes conclusiones de los reporteros y el deseo de éstos de convertirlas en noticia sensacional sólo provocaron la irritación de los Gorbachov de Neuquén.

Pero, de todas formas, a pesar de que Elías y Antonio no llegaron a aclarar si su relación con el Presidente de la URSS era una mera coincidencia de apellidos, todos los Gorbachov argentinos (y son 18) hablan mucho de él y se sienten vinculados a la vida de este hombre.

Conocí también a los hijos de Elías. Los tres ya han encontrado su lugar en la vida y ya están casados. Luis Roberto, el mayor, tiene 40 años de edad y trabaja en un banco. Juan Carlos, el que le sigue, es dueño de una pequeña zapatería. Oscar Alfredo, el menor, trabaja en el centro de cómputo municipal.

Para ellos, que nacieron y crecieron en Argentina, Rusia no es sólo la lejana partia de sus antepasados. Ellos heredaron de su abuelo y de su padre una especial actitud hacia Rusia, que en cada caso se manifiesta de manera diferente.

Creo que los hijos de los hijos de Elías también recordarán que su bisabuelo era de origen ruso y que, por consiguiente, en sus venas corre sangre rusa.

**«Eco del Planeta»**

## EL MOHO CONTRA LA RADIACION

Ultimamente los microscópicos hongos del moho han atraído la atención de los ecólogos. Resultó que en tierras adyacentes a la central electronuclear de Chernóbil habita un sinnúmero de hongos no afectados por la radiación, entre ellos, el célebre penicillium, del cual se hace la penicillina. Es más, los investigadores del Instituto de Microbiología y Virusología y del Instituto de Estudios Nucleares pertenecientes a la Academia de Ciencias de Ucrania aclararon que estos hongos incluso buscan y recogen partículas de polvo radiactivo y luego, al parecer, las gevoran. Los científicos efectuaron experimentos, ofreciendo a las colonias de moho dos tipos de partículas de polvo metálico: las "calientes", o sea, radiactivas, y las "frías" que no poseen irradiación. Bajo el microscopio se veía claramente que cada hongo extendía sus tentáculos hacia las partículas "calientes", las envolvía poco a poco y luego, durante 2—4 meses las destruía, literalmente devorando sus fragmentos. Estos últimos, asimilados por el organismo, fueron registrados por el contador de radiación dentro del hongo. El hecho de que los hongos devoren las partículas "calientes" infunde esperanzas de que esas partículas no penetren en las plantas cultas, sino que se queden en el mantillo del suelo. También se puede suponer que la descontaminación del terreno contaminado por este "método microbiológico" se reducirá a la simple recolección y a la evacuación de esta parte del suelo.

## PRUEBAS NUCLEARES SUBTERRANEAS Y TERREMOTOS

Hace relativamente poco surgió el problema referente a la posible vinculación de las pruebas nucleares subterráneas con los terremotos. Científicos moscovitas del Instituto de Física de la Tierra estudiaron la estadística de las pruebas nucleares realizadas en los polígonos de Semipalátinsk y del Estado norteamericano de Nevada, y a la vez, de todos los terremotos que en este tiempo se registraron en el Asia Central y California. Ya que se conocían las fechas exactas de estos y otros acontecimientos en el período de 1962 a 1988, fue posible comprobar si cambiaba o no la frecuencia de terremotos grandes y pequeños después de cada explosión nuclear. Se aclaró que el número de terremotos aumenta en los primeros 5—10 días después de cada prueba nuclear. ¡Los científicos aceptan casi por completo la hipótesis del aumento de la actividad sísmica en ambos polígonos!

Por supuesto, la explosión nuclear no es la "causante" del terremoto sino un "pretexto" de éste; el terremoto está madurando durante largo tiempo en las entrañas de la Tierra. A veces basta un temblor de baja intensidad para que el terremoto se produzca de inmediato. Al respecto, surge una idea distinta: ¿será posible controlar este proceso? Por ejemplo, cuando, según todos los indicios naturales, el terremoto está madurando, es posible adoptar a tiempo las medidas necesarias, evacuar a la población y los bienes y, luego, provocarlo mediante una pequeña explosión nuclear dando oportunamente salida a las peligrosas energías acumuladas en las entrañas de la Tierra.

### FLOTA MERCANTE PROPIA

La falta de salida directa al mar no es un obstáculo para que la República de Bielorrusia tenga su propia flota mercante, afirma Oleg Trúsov, diputado del parlamento bielorruso.

Las autoridades de San Petersburgo, afirma el diputado, no objetan la financiación por esta república de la construcción de diques y otras instalaciones en las orillas del Neva. Los primeros navegantes bajo el pabellón bielorruso podrían ser los marinos licenciados de la Flota Báltica. Entre los marinos de esta flota hay, tradicionalmente, un apreciable número de bielorrusos.



*Aprovechando el hecho de que este año el invierno no es frío, los deportistas de Minsk se entrenan en el lago Komsomolskoe.*

Foto: E. ELKCIN

**Redactor de la página**
**K. SHELESTÓVICH**

# БЕЛАРУСЬ—ПАРТНЁР ЮНЕСКА

Мірскі замак... Гордасць беларусаў, жамчужына еўрапейскай архітэктуры... У 1996 годзе гэтаму помніку сусветнага значэння споўніцца 500 гадоў. Меркавалася, што да юбілею, які стане культурнай падзеяй такога ж маштабу, як і, напрыклад, стагоддзе Максіма Багдановіча, архітэктурны шэдэўр будзе поўнасцю адрэстаўрыраваны. Але справіцца з такой складанай работай самастойна рэспубліцы не пад сілу. За дапамогай беларускі ўрад звярнуўся ў ЮНЕСКА. Запыт быў накіраваны прыкладна месяц назад. Сёння мы ўжо ведаем адказ на яго: Мірскі замак уключаны ў пералік аб'ектаў, што апякае ЮНЕСКА. Гэту прыемную навіну паведаміў на праведзенай у Мінску 9 снежня прэс-канферэнцыі генеральны дырэктар ЮНЕСКА Федэрыка Маёр.

Прэс-канферэнцыя была прысвечана вынікам афіцыйнага візіту пана Маёра ў Беларусь, у ходзе якога, як паведамлялася ўжо, былі падпісаны пратакол-мемарандум аб супрацоўніцтве паміж урадам нашай рэспублікі і ЮНЕСКА. На пытанні журналістаў адказалі Ф. Маёр, намеснік Старшыні Савета Міністраў РБ М. Дзямчук і міністр замежных спраў РБ П. Краўчанка.

— ЮНЕСКА гатова аказаць садзейнічанне развіццю патэнцыялу Беларусі ва ўсіх галінах духоўнага жыцця,— сказаў Ф. Маёр.— Сярод прыярытэтных праграм, зафіксаваных у мемарандуме, — захаванне культурнай спадчыны, якая аказалася ў зоне радыяцыйнага забруджвання, стварэнне пры Акадэміі навук Беларусі Міжнароднага даследчага цэнтра, правядзенне даследаванняў у галіне біятэхналогій, мікрабіялогіі, энергетыкі, камп'ютэрызацыі адукацыі.

Пан Маёр выказаў таксама надзею, што агульнымі намаганнямі ўдасца вярнуць на радзіму рэліквію беларускага народа — крыж Ефрасінні Полацкай.

У добрых намерах генеральнага дырэктара ЮНЕСКА, велізарным аўтарытэце ўзначальваемай ім арганізацыі сумнявацца не даводзіцца. Пётр Краўчанка напомніў, што іменна ЮНЕСКА першай адгукнулася на заклік Беларусі аб дапамозе ў ліквідацыі вынікаў чарнобыльскай катастрофы. Пры яе садзейнічанні на адпачынак і лячэнне ў краіны Заходняй Еўропы і Амерыкі выязджала звыш трох тысяч беларускіх дзяцей. Вядома, аднак, і іншае. ЮНЕСКА не мае значных сродкаў, не мае магчымасці непасрэдна фінансаваць большасць сваіх праграм. Зразумела, у журналістаў узнікла пытанне, ці не будуем мы, спадзеючыся, на дапамогу гэтай арганізацыі, паветраныя замкі? Бо кошт рэстаўрацыйных работ у тым жа Міры ацэньваецца ў 6 мільёнаў долараў. Дзе іх узяць?

Паводле слоў пана Маёра, пад эгідай ЮНЕСКА рэалізоўваліся і значна больш дарагія праекты.

Залог поспеху гэтай акцыі — значна актывізаваны ў апошні час удзел Беларусі ў рабоце ЮНЕСКА. Стаўшы суверэннай дзяржавай, рэспубліка выступіла з ініцыятывай распрацоўкі шэрагу міжнародных праграм. Вельмі важна таксама, на думку Ф. Маёра, што цяперашнія кіраўнікі Беларусі рэальна ацэньваюць яе магчымасці. З краіны-донара рэспубліка становіцца краінай-атрымальнікам дапамогі. Гэта абсалютна апраўдана, усёй сваёй гісторыяй, гераічнай і трагічнай, беларускі народ заслужыў права на ўвагу да сябе сусветнага супольніцтва, яго падтрымку ў святой справе нацыянальнага адраджэння.







**Мінскі дзіцячы сад № 507 называецца «Праменьчыкам». Наведваюць яго дзеці рабочых і служачых маторнага завода. Для дзятвы створаны ўсе ўмовы для гарманічнага развіцця. Цудоўныя добраўпарадкаваныя групы, спальні, зала для музычных заняткаў і танцаў. Але найбольш любяць малыя заняткі фізкультурай. У спартыўнай зале, добра аснашчанай спартыўным інвентаром, пад кіраўніцтвам трэнера Л. Сотнікава дзяўчынкі і хлопчыкі вучацца быць спрытнымі, дужымі, смелымі.**

**НА ЗДЫМКАХ: аркестр «Праменьчык» — часты госць гарадскіх святаў; у кожнай групе ёсць куток беларускай культуры; зрабіць «рыбку» вельмі цяжка, але затое прыемна.**

**Фота М. МІНКОВІЧА.**

# КАБ СВЯЦІЛІ ЗОРЫ

*Словы Л. ДРАНЬКО-МАЙСЮКА*

*Музыка В. КУЗНЯЦОВА*




**Свецяць зоры нам з табою**
**У нябёсах давідна.**
**Многа зорак над зямлёю,**
**А зямля заўжды адна.**

**Прыпеў:**

**Заўсёды яна**
**Будзе адна**
**Для сэрца дарагая.**
**Заўсёды яна**
**Толькі адна**
**Жыццё нам зберагае.**

**Бачыць зорную прастору**
**Любіш ты і я люблю.**
**Каб свяцілі ярка зоры,**
**Трэба думаць пра зямлю.**

**Прыпеў.**

# І Ў СПОРЦЕ РАЗДЗЯЛІЛІСЯ

У Францыі прайшло першынство свету па самба. Асобнай камандай тут выступіла зборная Рэспублікі Беларусь. Дэбют аказаўся вельмі ўдалым: 8 залатых медалёў. Застаецца толькі здагадвацца, колькі чэмпіёнаў мы недалічыліся б, каб выступалі, як і раней, у складзе каманды СССР.

На наступны год адмовіліся выступаць на першынстве былога Саюза нашы футбалісты. Такое рашэнне было прынята на чарговай канферэнцыі Федэрацыі футбола Рэспублікі Беларусь. А гэта значыць, што ў недалёкай будучыні мы зможам выступаць сваёй камандай і на міжнародных спаборніцтвах.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

НАШ АДРАС:

220600, МІНСК, ПРАСПЕКТ Ф. СКАРЫНЫ, 44.
ТЭЛЕФОНЫ: 33-01-97, 33-02-80, 33-03-15, 33-16-56, 33-07-82.

Газета аддрукавана ў друкарні
«Беларускі Дом друку»
Індэкс 63854. Заказ № 1979.

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12 М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12